Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне вышэйшых навучальных установ Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

# ЖЫВАПІС

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для вышэйшых навучальных устаноў*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-04 Народная творчасць (народныя рамёствы);*
*па спецыяльнасці 1-15 02 01 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-15 02 01-07 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2011

**Складальнікі:**

*У.І.Рынкевіч,* прафесар кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладного мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;

*У.П.Масленікаў,* дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладного мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**Рэцэнзенты:**

*кафедра* мастацкай і педагагічнай адукацыі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М.Танка”;

*У.Л.Зінкевіч,* прафесар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, загадчык кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва ўстановы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў”

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:**

*кафедрай* народнага дэкаратыўна-прыкладного мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 1 ад 31.08.2009 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 1 ад 08.09.2009 г.);

*навукова-метадычным* саветам па выяўленчым мастацтве, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, дызайне Вучэбна-метадычнага аб’яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 1 ад 18.09.2009 г.)

Адказны за рэдакцыю *І.В.Смяян*
Адказны за выпуск *У.І.Рынкевіч*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма распрацавана для вышэйшых навучальных установ Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйных стандартаў АСРБ 1-15 02 01-2008 і АСРБ 1-18 01 01-2008 “Народная творчасць (народныя рамёствы)”.

“Жывапіс” з’яўляецца адной з асноўных дысцыплін цыкла прадметаў па выяўленчым мастацтве пры падрыхтоўцы спецыялістаў мастацкіх спецыяльнасцей. Значная ўвага ў працэсе навучання надаецца ролі колеру.

Галоўнай *мэтай* вывучэння дысцыпліны з’яўляецца фарміраванне ў будучых спецыялістаў у галіне народнай творчасці прафесійнага мастацкага мыслення сродкамі колеравых спалучэнняў. Дысцыпліна дае магчымасць будучым мастакам набыць неабходныя ўменні, якія дазволяць ім выконваць канкрэтныя творчыя задачы на высокім прафесійным узроўні.

*Задачы вывучэння дысцыпліны:*

– навучыць арганізацыі тонавай кампазіцыі і каларыстычнай цэльнасці жывапіснага твора;

– прывіць навыкі пісьма ў розных відах работ (эцюд, эскіз, станковая карціна) і жанрах жывапісу (нацюрморт, пейзаж, партрэт);

– навучыць фарміраваць канцэптуальны замысел твора і рабіць прафесійны аналіз жывапіснага твора.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– тэхніку алейнага жывапісу;

– тэхніку акварэльнага і іншых відаў вадзянога жывапісу;

– законы прасторавай пабудовы жывапісных работ;

– прыёмы кампазіцыйнага вырашэння жывапісных работ;

– прыёмы танальнай і колеравай распрацоўкі жывапісных работ;

– этапы выканання жывапіснай работы.

Студэнт павінен *умець*:

– у адпаведнасці з агульнапрынятымі класічнымі акадэмічнымі нормамі выканаць і афарміць жывапісную работу;

– арганізоўваць забеспячэнне мастацкай цэльнасці работы тэхнічнымі сродкамі жывапісу;

– дакладна будаваць кампазіцыю жывапісных работ;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– выкарыстоўваць розныя мастацкія тэхнікі жывапісу, а таксама розныя прыёмы танальнай і каляровай распрацоўкі жывапісных работ.

Для фарміравання ў студэнтаў спецыфічнага, “дэкаратыўнага” бачання навакольнага свету падбіраюцца спецыяльныя натурныя заданні і ставяцца вучэбныя задачы.

Змест праграмы абумоўлівае выкарыстанне адпаведных метадаў выканання аўдыторных і самастойных работ, прыкладныя якасныя і колькасныя характарыстыкі натурных пастановак, канкрэтызацыю асноўных задач, якія неабходна выканаць студэнту. Згодна з асаблівасцямі індывідуальнай методыкі педагог карэкціруе задачу, якая можа быць часткова зменена ў залежнасці ад канкрэтных педагагічных абставін (асаблівасць складу студэнцкай групы, аснашчанасць майстэрні і да т.п.). Прапанаваныя тэматыка і прадметны склад нацюрмортаў не з’яўляюцца абавязковымі, яны маюць рэкамендацыйны характар. Кожнае заданне тэм 1 і 2 прадугледжвае пастаноўку нацюрмортаў студэнтамі пад наглядам педагога. Пастаноўка жывой натуры (тэмы 3 і 4) здзяйсняецца педагогам і студэнтамі разам. Па ўзгодненасці з педагогам студэнт выбірае матэрыял выканання (алейныя фарбы, акварэль, тэмпера), тэхніку выканання работы (прыёмы і стылістыка пісьма), від карціннай плоскасці (палатно на падрамніку, грунтаваны кардон, папера, якая нацягнута на планшэт, або асобны папяровы аркуш).

Тыповым фарматам работ для нацюрмортаў і эцюдаў галавы з’яўляецца карцінная плоскасць прамавугольнай формы 50×70 см, а для пленэрных эцюдаў сярэдні памер работ – 30×40 см. Заданні, якія прадугледжваюць аб’ёмна-прасторавыя пастаноўкі (нацюрморт у інтэр’еры, партрэт з рукамі, фігура чалавека і інш.), выконваюцца на лісце фарматам 100×70 см.

Выкладанне дысцыпліны “Жывапіс” прадугледжвае шырокае выкарыстанне педагогам такіх метадаў навукова-творчага пазнання, як назіранне, аналітычнае параўнанне і абагульненне, аналіз і сінтэз. Задачы, якія сфармуляваны для заданняў, вызначаюць асноўныя крытэрыі ацэнкі вучэбных твораў і на кантрольных праглядах. Бягучы кантроль за выкананнем аўдыторных і самастойных заданняў здзяйсняе вядучы педагог на кожным занятку. Рубежныя і выніковыя прагляды

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(залікі і экзамены) у мэтах большай аб'ектыўнасці ацэнак праводзяцца камісіяй, якая складаецца з педагогаў дысцыплін цыкла выяўленчага мастацтва.

Праграма "Жывапіс" па тэматыцы, відах дзейнасці і ступені складанасці заданняў збалансавана з праграмамі іншых спецыяльных дысцыплін ("Малюнак", "Колеразнаўства", "Перспектыва", "Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва").

Тыпавымі вучэбнымі планамі на вывучэнне дысцыпліны "Жывапіс" адведзена максімальна 908 гадзін: для напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-04 "народная творчасць (народныя рамёствы)" прадугледжаны 474 аўдыторныя гадзіны, з іх 16 гадзін – лекцыі, 458 гадзін – практычныя заняткі; для напрамку спецыяльнасці 1-15 02 01-07 "дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў)" прадугледжана 490 аўдыторных гадзін, з іх 18 гадзін – лекцыі, 472 гадзіны – практычныя заняткі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Народная творчасць | | Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва | |
|---|---|---|---|---|
| | колькасць аўдыторных гадзін | | | |
| | лекцыі | практ. зан. | лекцыі | практ. зан. |
| 1. Уводзіны. Асновы тэхнікі і тэхналогіі станковага жывапісу. Тон і колер – галоўныя выразныя сродкі жывапісу | 4 | 102 | 4 | 84 |
| 2. Асаблівасці жывапісна-пластычнага ўвасаблення рэчаўна-прасторавага асяроддзя інтэр'ера і пейзажа | 4 | 100 | 4 | 102 |
| 3. Метад работы танальна-колеравымі адносінамі ў адлюстраванні жывой натуры. Выява галавы чалавека | 4 | 136 | 4 | 118 |
| 4. Жывапіснае адлюстраванне фігуры чалавека ў прасторавым асяроддзі | 4 | 120 | 6 | 168 |
| **Усяго…** | **16** | **458** | **18** | **472** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Тэма 1. Уводзіны. Асновы тэхнікі і тэхналогіі станковага жывапісу. Тон і колер – галоўныя выразныя сродкі жывапісу

Жывапіс як самастойны від выяўленчага мастацтва, выразныя сродкі жывапісу. Разнастайнасць відаў станковага жывапісу па матэрыялах і прызначэнні. Матэрыялы і інструменты, абсталяванне працоўнага месца ў жывапіснай майстэрні, экіпіроўка мастака на пленэры. Жанравая разнастайнасць, тэматыка, сюжэты і матывы жывапісу. Эвалюцыя жывапісу ў матэрыялах і тэхналогіі. Спецыфіка тэхналогіі акварэльнага, гуашавага, тэмпернага, акрылавага і алейнага жывапісу. Тэхніка бяспекі працы жывапісца ў вучэбнай майстэрні і на пленэры.

Узаемасувязь спецыяльных дысцыплін і сістэмны падыход да вывучэння законаў акадэмічнага жывапісу. Тон і колер як асноўныя выразныя сродкі жывапісу. Танальныя адносіны – аснова кампазіцыі жывапіснага твора. Каларыт як гарманічная сістэма колераў. Вучэбная і творчая задачы ў выкананні практычных заданняў. Эцюд (штудыя) як асноўны від вучэбнай работы. Этапнасць працы над вучэбнымі натурнымі пастаноўкамі і пейзажнымі матывамі. Крытэрыі ацэнкі выканання праграмных заданняў.

На пачатковым этапе прапанаванага курса студэнту даецца магчымасць на практыцы далучыцца да асэнсавання паняцця “спецыфічнае мысленне жывапісца”. Інакш кажучы, студэнту прапануецца паспрабаваць “убачыць” рэчаіснасць не праз прамое адлюстраванне рэчаў, якія маюць тонава-каляровыя характарыстыкі, а “паглядзець” на свет з пэўнай доляй умоўнасці, гіпербалізуючы колеравыя ўласцівасці прадметаў. Пры гэтым аб’ёмныя формы і сілуэты, матэрыяльнасць рэчаў страчваюць актуальнасць і ў жывапіснай працы нівеліруюцца выканаўцам амаль да абстрактных (шырока абагульненых) формаў. Задачай практычнага задання з’яўляецца стварэнне плоскаснай жывапіснай кампазіцыі на аснове натурнай пастаноўкі. Нацюрмортная пастаноўка ставіцца ў адной вертыкальнай плоскасці. Яна можа ўключаць у сябе рэчы без выразнага рэльефа вольных сілуэтаў: фігуры простых геаметрычных формаў з тканіны, лісця, рознакаляровых арку-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шаў кардона. У пастаноўку пажадана ўключыць рэч белага колеру, напрыклад аркуш паперы. У гэтым выпадку белая пляма ў кампазіцыі будзе выконваць ролю камертона. Крытэрыямі ацэнкі гэтага задання, як і наступных заданняў тэмы, з'яўляюцца:

– завершанасць тонавай кампазіцыі (лагічна абгрунтаванае размяшчэнне і тонавыя суадносіны колеравых плям у адпаведнасці з натурай, вызначэнне кампазіцыйнага цэнтра і сілавой лініі кампазіцыі);

– каларыстычная цэльнасць кампазіцыі (фарміраванне колеравай гармоніі выявы, па сродках узгаднення цёплых і халодных колераў);

– упэўненае валоданне класічнай тэхнікай жывапіснага пісьма (для вадзянога жывапісу – заліўка і мазок па сухой паперы, для алейнага і іншых відаў крыючага жывапісу – лесіровачныя заліўкі і пастозны мазок).

Далейшае засваенне законаў фарміравання тонавай кампазіцыі і каларыту будуецца на паслядоўным выкананні нескладаных па рэчаўным складзе і колеравых характарыстыках нацюрмортаў:

– нацюрморт у халоднай гаме (складаецца з двух–трох рэчаў хатняга ўжытку на фоне драпіровак);

– нацюрморт у цёплай гаме (пастаноўка складаецца з кошыка і некалькіх пладоў агародніны і садавіны на фоне драпіровак );

– "белы" нацюрморт (пастаноўка ў светлай, блізкай да белага колеру нюанснай гаме з трох–чатырох рэчаў хатняга ўжытку на фоне драпіровак);

– "цёмны" нацюрморт (пастаноўка складаецца з трох–чатырох рэчаў і драпіровак з перавагай цёмнай танальнай гамы ў рассеяным асвятленні);

– "стракаты" нацюрморт (складаецца з трох–чатырох рэчаў розных колераў на фоне рознакаляровых драпіровак);

– "пяшчотны" нацюрморт (складаецца з трох–чатырох рэчаў хатняга ўжытку на фоне драпіровак мяккай зблiжанай танальнасці).

Паралельна з аўдыторнай работай засваенне вучнямі асноватворных законаў жывапісу вядзецца, працуючы з натуры ў асяроддзі прыроды. Студэнтам прапануецца самастойна выканаць некалькі серый эцюдаў (па тры–чатыры работы кожная серыя, фармат А-4):

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– зямля–неба (просты матыў ландшафтнага краявіду без яўна выяўленых дэталяў);

– зямля-вада–неба (возера, рака з берагам на першым плане);

– далягляд (ландшафтны краявід з выразнымі планамі);

– зімовы краявід (ландшафтны матыў заснежанага поля з дрэвамі);

– вясновы краявід (матыў раставання снегу, вясновае абуджэнне прыроды);

– вясковы матыў (сялянскі двор, вясковая вуліца);

– гарадскі матыў (вуліца сучаснага гарадскога мікрараёна).

З мэтай вывучэння традыцыйных тэхнік жывапісу студэнтам таксама прапануецца самастойна выканаць копіі з арыгіналаў дзвюх жывапісных работ "старых" майстроў (пейзаж і нацюрморт), якія выстаўлены ў музейных экспазіцыях, або па рэпрадукцыях вялікага памеру добрай якасці друку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 2 . Асаблівасці жывапісна-пластычнага ўвасаблення рэчаўна-прасторавага асяроддзя інтэр'ера і пейзажа

Стылістычныя асаблівасці класічнага жывапісу. Разнастайнасць прыёмаў і спосабаў пісьма сучаснага жывапісу. Нетрадыцыйныя матэрыялы і інструменты жывапісу. Значэнне фарміравання мастацкага почырку і індывідуальнай манеры пісьма. "Святлопісанне" ў жывапісе. Выразныя сродкі перадачы паветранага асяроддзя рэчаўнага свету. Асаблівасці жывапіснага адлюстравання фізічных характарыстык (матэрыяльнасці) рэчаў у абмежаваным прасторавым асяроддзі.

Паглыбленне навыкаў фарміравання тонавай кампазіцыі, каларыту, а таксама стварэнне ілюзіі прасторы, матэрыяльнасці рэчаў адбываюцца пры паслядоўным выкананні нескладаных нацюрмортаў, якія розняцца па рэчаўным складзе і колеравых характарыстыках:

– з драўлянымі рэчамі сялянскага побыту (у склад нацюрморта могуць уваходзіць драўляныя рэчы хатняга ўжытку і традыцыйныя прылады працы беларусаў: кадушка, маслабойка, кош, абрэзак струганай дошкі, рубанак і да т.п.);

– з металічнымі рэчамі этнаграфічнага характару простай геаметрычнай формы (стары вугальны прас, самавар,

чыгунок і да т.п. або сучасныя рэчы сталовага посуду: нікеліраваны кафейнік, заварнік, паднос);

– са шклянымі празрыстымі рэчамі (графін, бутэлька, шклянка, люстэрка ў кантрасным асвятленні);

– з тканінай (драпіроўкі). Пастаноўка складаецца з некалькіх драпіровак розных фактур і колераў з мінімальнай прасторавай глыбінёй;

– з ганчарнымі або керамічнымі вырабамі і раслінамі (сухацветы, каласы жыта, саламяныя кветкі) у цёплай гаме;

– з чучалам птушкі, чэрапам жывёлы або футрай у цёмнай гаме.

Паралельна з аўдыторнай вучнямі вядзецца работа з натуры ў асяроддзі прыроды. Студэнтам прапануецца самастойна выканаць некалькі серый эцюдаў (па тры–чатыры работы кожная серыя, фармат А-4):

– эцюды індустрыяльнага пейзажа (у якасці аб'ектаў адлюстравання могуць быць абраны заводскія карпусы, электрастанцыя, элеватар, чыгуначныя пераезды і аўтадарожныя віядукі, будаўнічыя пляцоўкі і іншыя прамысловыя аб'екты);

– эцюды гарадскога пейзажа (у якасці аб'екта адлюстравання могуць быць абраны від новага мікрараёна або куток старога горада, завулак, двор; дзіцячая пляцоўка, магчыма са стафажнымі фігурамі людзей і хатніх жывёл);

– эцюды матыву з дрэвамі ў тонавым і колеравым кантрасце ("дрэвы-кантраст", чатыры працы фарматам А-3, А-4: дрэвы ў восеньскім убранні або ўсохлыя "голыя" дрэвы ў яркім сонечным асвятленні і рэзкім цені, асветленыя вячэрнім сонцам на фоне цёмнага неба або ствалы дрэў з адлюстраваннем у вадзе і да т.п.). Далейшая распрацоўка задання – стварэнне станковай жывапіснай кампазіцыі на гэтую ж тэму;

– эцюды краявіду ў ранішні ці вячэрні змрочны час ("дрэвы-нюанс", чатыры работы фарматам А-3, А-4. У якасці аб'екта адлюстравання можа быць абраны ландшафтны шматпланавы матыў з полем, возерам, лесам без яўна азначаных сілуэтаў асобных аб'ектаў). Далейшая распрацоўка задання – стварэнне станковай жывапіснай кампазіцыі на гэтую ж тэму.

Практычная работа падпарадкавана выкананню наступных задач: перадача аб'ёмна-прасторавых характарыстык пастаноўкі, выяўленне планавасці пастаноўкі, прапарцыянальнасці і канструктыўнай структуры рэчаў; стварэнне цэльнай кала-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рыстычнай гамы. У кантэксце вырашэння кампазіцыйных, пластычных і каларыстычных задач студэнтам неабходна знайсці аптымальныя выразная сродкі (тэхналагічныя прыёмы пісьма), якія адпавядаюць выяўленню рэльефнасці і фактуры розных матэрыялаў.

У мэтах пашырэння дыяпазону выяўленчых сродкаў жывапісу студэнтам прапануецца таксама самастойна выканаць работы малога фармату:

– мініяцюра (пейзажны матыў тыповага беларускага ландшафтнага краявіду на аснове асабістага эцюднага матэрыялу. Фармат прыблізна роўны паштоўцы, не больш за фармат аркуша А-5);

– “падманка” (нацюрморт невялікага памеру, напісаны ў натуральную велічыню двух–трох рэчаў, аб’яднаных пэўным сэнсам: гузікі, іголка з ніткай, аўтобусны білет, манета, запалкі, лязо, пёры і да т.п.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 3. Метад работы танальна-колеравымі адносінамі ў адлюстраванні жывой натуры. Выява галавы чалавека

Жывапіс галавы чалавека. Канструктыўная пабудова складанай формы. Выяўленне характэрных прапорцый, дэталей і цэлага. Танальнае адзінства і пластычная выразнасць. Колеравыя адносіны. Уплыў навакольнага асяроддзя на колеравую характарыстыку формы. Распрацоўка дэталей пры захаванні цэласнасці вялікай формы. Выяўленне галавы ў тэхніцы грызайля. Асаблівасці жывапісу галавы ў дзённым асвятленні ў інтэр'еры і ва ўмовах пленэра. Жывапіс галавы ва ўмовах штучнага асвятлення.

Віды партрэта. Асаблівасці кампазіцыі. Задачы партрэтнага жывапісу. Мастацкая вобразнасць у партрэтным жанры. Перадача знешняга падабенства партрэтуемага, узроставай характарыстыкі, прафесійнай прыналежнасці. Жывапісна-пластычная характарыстыка твару і кісцей рук. Адбор галоўнага і характэрнага, першазначнага, індывідуальна непаўторнага.

Засваенне законаў работы танальна-колеравымі адносінамі ў адлюстраванні жывой натуры будуецца пры выкананні наступных заданняў з паслядоўным ускладненнем задач:

– нацюрморт з гіпсавым злепкам галавы чалавека, некалькіх рэчаў і драпіровак;

– эцюд галавы чалавека (грызайль);

– эцюд галавы чалавека на нейтральным фоне;
– эцюд галавы чалавека на халодным фоне;
– эцюд галавы чалавека на цёплым фоне.

Паралельна з аўдыторнай работай для замацавання вывучанага матэрыялу студэнтам прапануецца выканаць некалькі самастойных заданняў:
– кароткатэрміновыя эцюды галавы чалавека;
– эцюд аўтапартрэта.

## Тэма 4. Жывапіснае адлюстраванне фігуры чалавека ў прасторавым асяроддзі

Метад работы колеравымі адносінамі і цэльнасць успрымання натуры ва ўмовах пленэра. Жывапіс краявіду са стафажнымі фігурамі чалавека і фігурамі жывёл. Успрыманне і перадача асноўных колеравых адносін. Агульны колеравы і тонавы стан асветленасці. Колеравы нюанс святла і каларыстычнае адзінства аб’ектаў краявіду. Выяўленне дэталей краявіду. Перадача ілюзіі прасторавай глыбіні краявіду.

Жывапіс фігуры чалавека. Роля і значнасць асноў пластычнай анатоміі ў адпаведнасці з кампазіцыйнай пабудовай жывой мадэлі: характэрная пастава, паварот фігуры, рух рук і інш. Этапнасць работы над выявай чалавека: накіды, эскізы, падрыхтоўчы малюнак, работа ў колеры над арыгіналам, прапрацоўка дэталей. Дасягненне дакладнасці пабудовы формы праз абагульненне жывапіснага строю работы. Стылістыка жывапісна-пластычнага рашэння.

Веды і навыкі жывапіснага адлюстравання фігуры чалавека замацоўваюцца паслядоўным выкананнем натурных пастановак:
– партрэт натуршчыка ў стрыманай колеравай гаме на нейтральным фоне;
– партрэт натуршчыцы ў кантрасным бакавым асвятленні на актыўным колеравым фоне;
– кароткатэрміновы эцюд фігуры чалавека ў інтэр’еры.
– фігура чалавека ў народнай вопратцы.

Для лепшага засваення пройдзенага матэрыялу
прапануецца выкананне самастойных заданняў:
– кароткатэрміновыя эцюды краявідаў са стафажнымі фігурамі чалавека;
– эцюды фігуры чалавека ў экстэр'еры (сонечны дзень, шэры дзень).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


1. *Беда, Г.В.* Живопись и ее выразительные средства / Г.В.Беда. – М.: Изобразительное искусство, 1977. – 174 с.
2. *Волков, Н.Н.* Композиция в живописи / Н.Н.Волков. – М.: Искусство, 1977. – 216 с.
3. *Волков, Н.Н.* Цвет в живописи / Н.Н.Волков. – М.: Искусство, 1965. – 216 с.
4. *Горощенко, Г.Т.* Акварель: учеб. пособие / Г.Т.Горощенко. – М.: Изобразительное искусство, 1966. – 156с.
5. *Кальнинг, А.К.* Акварельная живопись: краткое руководство / А.К.Кальнинг. – М.: Искусство, 1968. – С. 42–60.
6. *Масленікаў, У.П.* Алейны жывапіс / У.П.Масленікаў. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2006. – 75 с.
7. *Михайлов, А.М.* Искусство акварели / А.М.Михайлов. – М.: Искусство, 1995. – 234 с.
8. *Рынкевіч, У.І.* Акварэльны жывапіс / У.І.Рынкевіч. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 1998. – 88 с.
9. *Рынкевіч, У.І.* Мастацтва акварэлі / У.І.Рынкевіч. – Мн.: Беларусь, 2001. – 119 с.
10. *Столяров, И.М.* Акварель: материалы и способы письма / И.М.Столяров. – Мн.: Народная асвета, 1980. – 82 с.
11. *Унковский, А.А.* Вопросы колорита / А.А.Унковский. – М.: Просвещение, 1980. – 117 с.
12. *Яшухин, А.П.* Живопись / А.П.Яшухин. – М.: Просвещение, 1985. – 287 с.


*Дадатковая*


1. *Бяспалы, А.А.* Беларуская акварэль: альбом / А.А.Бяспалы. – Мн.: Беларусь, 1978. – С. 5–8.
2. *Беспалый, А.А.* Белорусская акварель / А.А.Бяспалы. – Мн.: Наука и техника, 1989. – С. 3–80.
3. *Латышская* советская акварельная живопись: альбом / сост. и автор текста Р.К.Бем. – Рига: Лиесма, 1974. – С. 5–16.
4. *Михайлов, А.М.* Искусство акварели / А.М.Михайлов. – М.: Искусство, 1995. – 234 с.
5. *Павло, В.* Сучасна українська акварель. – Київ: [Б.и.], 1978. – С. 8–15.
6. *Современная* советская акварель: альбом / сост. и авторы текста В.И.Володин, Н.А.Володина. – М.: Сов. художник, 1983. – С. 5–25.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ЖЫВАПІС**

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для вышэйшых навучальных устаноў*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-04 Народная творчасць*
*(народныя рамёствы);*
*па спецыяльнасці 1-15 02 01 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва*
*(па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-15 02 01-07 Дэкаратыўна-прыкладное*
*мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў)*


Рэдактар І.В.Смяян
Тэхнічны рэдактар Л.М.Мельнік

Падпісана ў друк 2011 г. Фармат 60х84$^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 0,81. Ул.-выд. арк. 0,54.
Тыраж экз. Заказ .

УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 02.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ